View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

І.М. Гоўзіч, Мінск

**Сац-арт у рускай і беларускай паэзіі другой паловы ХХ стагоддзя**

Стан паэзіі (і літаратуры ў цэлым) канца мінулага стагоддзя, як рускай, так і беларускай, вызначае сітуацыя выбуху, ломкі і пераарыентацыі / пераходу ад класічна-традыцыйнага адлюстравання свету / рэчаіснасці / быцця да ўвасаблення не самога быцця, а іншасказання аб ім, гіпатэтычнага варыянту яго пераасэнсавання. Такім чынам, на першы план у мастацкім творы выходзіць ірэальнае як прыхаваная заканамернасць быцця, метафара, іншасказанне, метамарфоза, якая пераўтварае прывычна-рэальнае ў непазнавальна-неспазнанае.

Сучасная руская і беларуская паэзія — складаныя шматгранныя з'явы, пазначаныя «арыгінальнымі мастацкімі набыткамі, жанравай і стылёвай дынамікай, цікавымі творчымі пошукамі» [1, с. 39], у «прасторава-часавай структуры» якіх перакрыжоўваюцца дасягненні розных пісьменніцкіх пакаленняў і мастацкіх кірункаў. Калі прадстаўнікі старэйшых пакаленняў (франтавога і шасцідзясятнікаў) вымушаны былі кардынальна перагледзець свае мастацкія прынцыпы, то маладзейшыя творцы далучыліся да пераймання / пераўвасаблення ўзораў літаратурных школ у еўрапейскіх літаратурах і літаратуры ЗША

Разам з тым, найноўшая руская і беларуская паэзія напрыканцы ХХ стагоддзя, як гэта не парадаксальна гучыць, працягвае развівацца ў рэчышчы тых мастацкіх кірункаў, якія былі закладзены ў перыяд Сярэбранага стагоддзя сімвалістамі, авангардыстамі і футурыстамі ў Расіі, а таксама мадэрнісцкімі пошукамі маладнякоўцаў на Беларусі. Так па словах даследчыкаў сучаснага літаратурнага працэсу, «у 1970-я гады ў нетрах андэграўнда <…> фарміруецца паэзія новааванргадысцкай накіраванасці, якая мела на мэце не толькі аднавіць традыцыі рускага авангарду пачатку стагоддзя (В. Хлебнікаў, А. Кручоных, Д. Бурлюк і інш.), але і засвоіць вопыт шматлікіх плыняў еўрапейскага і амерыканскага мадэрну (сюррэалізм, поп-арт, «новы раман», машынна-матэматычная паэзія і інш.)» [4, с. 49].

У другой палове 1980-х гадоў у Расіі гучна заявілі пра сябе такія новаавангардысцкія па сваёй скіраванасці паэтычныя групы / аб'яднанні як канцэптуалізм, метамарфізм, неафутурызм, куртуазны ман'ерызм, сац-арт, рок-арт і інш. Сучасны літаратуразнавец Г. Ісаеў вызначае неаавангардызм як крайнюю праяву постмадэрнізму, чарговую стадыю авангардызму. Вызначым дамінантныя асаблівасці новага кірунку ў літаратуры канца ХХ стагоддзя:

а) «грамадская рэчаіснасць для паэтаў-авангардыстаў абсурдная, антыгуманная» [4, с. 49];

б) герой — homo soveticus — «надзвычай сацыялагізаваная асоба, якая гаворыць пераважна на добра адрэпеціраванай, высокаідэйнай і высокалітаратурнай мове ідэйных і літаратурных штампаў» [8, с. 234];

б) выкарыстанне прынцыпаў цэнтоннай \ інтэртэкстуальнай паэзіі;

в) аўтарская іронія як адзін з асноўных канструктыўных элементаў;

г) полістылістыка твораў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

д) метафарычнасць мовы.

Адным з першых кірункаў новаавангардысцкай паэзіі стаў канцэптуалізм (Д. Прыгаў, І. Холін, Ус. Някрасаў, У. Друк, Л. Рубінштэйн і інш.), які атрымаў назву дзякуючы артыкулу Б. Гройса «Маскоўскі рамантычны канцэптуалізм». Творчасць названых прадстаўнікоў кірунку характарызуецца інтэртэкстуальнасцю / калажнасцю / цэнтоннасцю, а мастацкая арыгінальнасць выяўляецца ў «выбары, спляценні, інтанаванні канцэптаў <…> у якасці канцэпцый адсутных і ўжо, па сутнасці, непатрэбных твораў» [8, с. 228]. Аснова твораў канцэптуалістаў — іронія і сатыра з нагоды «саўковай» свядомасці людзей, а філасофія жыцця паўстае калькаванай, зніжанай да прымітыўнай свядомасці сярэдняга чалавека.

Вельмі блізкім да канцэптуалізму стаў сац-арт, які знайшоў увасабленне і ў творчасці згаданых канцэптуалістаў Д. Прыгава, Л. Рубінштэйна, У. Друка, і ў мастацтве І. Ірценьева, Н. Іскранка, Ц. Кібірава і іншых паэтаў канца ХХ стагоддзя. Прынцыповым адрозненнем канцэптуалізму і сац-арту з'яўляецца падкрэсленая сацыяльнасць і выкарыстанне табуіраванай / забароненай лексікі — бытавых і ідэалагічных клішэ.

Адным з яскравых прадстаўнікоў сац-арту з'яўляецца Цімур Кібіраў, імя якога ўжо апасродкавана адсылае рэцыпіента да слаўнага савецкага мінулага — твора А. Гайдара «Цімур і яго каманда». Рускі крытык А. Зорын абсалютна справядліва і абгрунтавана зазначаў, што творы (тэксты) Ц. Кібірава — «гэта, па сутнасці, інвентар жабрацкага роднага і пачварнага побыту мінулых дзясяцігоддзяў жыцця, воблік якога паэт, падобна палеантолагу ўзнаўляе па урыўках папулярных песень, газетных лозунгаў <…> прапагандысцкімі клішэ» [3, с. 3].

Так верш Ц. Кібірава «Речь товарища К.У. Чарненко на юбилейном пленуме правления Союза писателей СССР 25 сентября 1984 года» — твор цэнтоннага характару, які складаецца з урыўкаў прамовы К.У. Чарненкі, якая перыядычна перапыняецца ўстаўнымі канструкцыямі з нібыта-рэальных слоў-рэплік «забранзавелых класікаў-літаратараў» (С. Міхалкова, Р. Гамзатава, Я. Еўтушэнкі, Р. Раждзественскага і інш.), якія абмяркоўваюць стан здароўя Генеральнага сакратара ЦК КПСС, мараць пра светлую будучыню і далейшыя перспектывы развіцця літаратуры:

> Вот гул затих. Он вышел на подмостки.
> Прокашлявшись, он начал: «Дорогие
> товарищи! Ваш пленум посвящен
> пятидесятилетию события
> значительного очень…». Михалков,
> склоняясь к соседу, прошептал: «Прекрасно
> он выглядит. А всё ходили слухи,
> что болен он». «— Тс-с-с! Дай послушать!» — «…съезда
> писателей советских, и сегодня
> на пройденный литературой путь
> мы смотрим с гордостью. Литературой,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

в которой отражение нашли
двадцатого столетия революции-
оные преобразования!». Взорвался
аплодисментами притихший зал. Проскурин
неистовствовал. Слёзы на глазах
у Маркова стояли. А Газматов.
забывшись, крикнул что-то по-аварски,
но тут же перевёл: «Ай, молодец!».
Невольно улыбнувшись, Константин
Устинович продолжил выступленье [6, с. 493—494].

Творы Ніны Іскранка — полістылістычныя, інтэртэкстуальныя ў сваёй аснове, гэта не толькі цытаты з прамоў / выказванняў знакамітых асоб не толькі савецкага часу, але і ўзнаўленне стылістыкі арыгіналаў, спалучэнне высокага «кніжнага» стылю і зніжанай, табуіраванай лексікі.

Леў Рубінштэйн пераважна з'яўляецца прыхільнікам (тэарэтыкам і практыкам) канцэптуалізму, але да сац-арту з поўным правам можна аднесці яго тэксты-каталогі як фіксацыі ўстойлівых штампаў, якія ператвараюць жывую мову ў набор стандартных клішэ:

— Ну что я вам могу сказать?
— Он что-то знает, но молчит.
— Не знаю, может, ты и прав.
— Он и полезней, и вкусней.
— У первого вагона в семь.
— Там дальше про ученика.
— Пойдёмте. Я как раз туда.
— Ну что, решили что-нибудь?
— Сел и до самого конца [6, с. 498].

Іроніяй поўняцца вершы Уладзіміра Друка, заснаваныя на гульні словаў, пераасэнсаванні стандартызаваных моўных штампаў і клішэ з савецкага мінулага, якое ў творчасці пісьменніка набывае не адмоўнае ўвасабленне і публіцыстычную завостранасць, а іранічнае высмейванне недарэчнасцей («Орлята», «Автобурет», «Эпитафия»):

Я новый мир хотел построить.
Да больше нечего ломать [6, с. 506].

Развіццё сац-арту ў беларускай літаратуры звязана з дзейнасцю літаратурарнага руху / аб'яднання / таварыства «Бум-Бам-Літ» (Зміцер Вішнёў, Серж Мінскевіч, Алесь Туровіч, Віктар Жыбуль і інш.), які «вызначыў агульны кірунак літаратурнага авангарду на цэлае дзесяцігоддзе ‹...› стаўшы назыўным для тых з'яў літаратуры, якія характарызуюцца падкрэсленай эпатажнасцю, фармалістычнасцю падыходаў пры выбары мастацкіх сродкаў, дэструктыўнасцю на ўсіх узроўнях — ад моўнага да лагічна-змястоўнага» [5, с. 28—29]. Творчасць паводле тэорыі і практыкі гэтага таварыства павінна быць пазбаўлена класічнага жанрава-тэматычнага аблічча і ўяўляць сабой своеасаблівую самапрэзентацыяю аўтараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адраджэнне адной з нетрадыцыйных і новых для нацыянальнай паэзіі вершаваных форм — паліндрома (верша, які можа чытацца ў адваротным парадку без змен зместу — звязана з літаратурнай дзейнасцю Віктара Жыбуля, Сержа Мінскевіча, Пятра Васючэнкі і іншых аўтараў. Так у паэме-паліндроме В. Жыбуля «Рогі гор» можна знайсці рысы сац-арту:

У дар ураду —
замак, КАМаз,
ЗАЗ,
а дар урада —
шалаш...
А нам — масам — мана,
нам — зман...
Усё?.. Лёсу,
марам —
канец!? (Са зману нам — засценак!)
Енк? Не! [7, с. 54].

Своеасаблівай мастацкай інтэрпрэтацыяй гістарычных падзей і новых, не заўсёды пазітыўных, зменаў у сацыяльным, грамадскім і літаратурным жыцці на мяжы стагоддзяў з'яўляюцца вершы Усевалда Гарачкі са зборніка «Пралетарскія песні», пранізаныя на з'едлівым сарказмам і чорным гумарам. Традыцыйныя жанры пракламацыі, агіткі набываюць у творчасці паэта выразны пафас адмаўлення, крытычны пачатак у іх пераважае над эталагічным, а многія сітуацыі ў вершах даводзяцца да абсурду: «Не хадзі на завод: / Там рагоча / Страшэнны рабочы! / Не хадзі на завод!» [13, с. 20]; «У стылі барока / Будуюць баракі. / У гэтых бараках жывуць батракі» [13, с. 13]. Дасціпным гумарам і іроніяй вызначаюцца эпіграмы, прысвечаныя В. Жыбулю, Зм. Вішнёву, А. Сысу і іншым паэтам, у якіх па-майстэрску выкрываюцца асноўныя недахопы і клішэ ў творчасці ўзгаданых мастакоў: «...І ў маім садзе / Расце яблык. / Надзену фрак, / Цыліндр і кій / Вазьму. / Пайду, / Саб'ю яблык» (Зм. Вішневу) [13, с. 34]; «Ты не пі кампот: / Гэта ягад пот» (В. Жыбулю) [13, с. 35].

**Спіс літаратуры**

1. Бельскі, А.І. Паэзія / А.І. Бельскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / навук. рэд. У.В. Гніламёдаў [і інш.] / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. ім. Я. Купалы. — Мінск: Беларус. навука, 2003. — Т. 4, кн. 2.— С. 39 — 87.

2. Гарачка, У. Пралетарскія песні: Вершы / У. Гарачка. — Мінск: Логвінаў, 2004. — 72 с.

3. Зорин, А. Ворованный воздух А. Зорин. Феномен Тимура Кибирова // Московские новости. — 19 января 1992. — № 3. — С. 3.

4. Исаев, Г.Г. Русская литература конца 1980-х — первой половины 1990-х годов / Г.Г. Исаев // Современная русская литература: Хрестоматия для средней и высшей школы /сост.: В.Н. Гвоздей, М.Ю. Звягина, Г.Г. Исаев [и др.]; вступ. ст. Г.Г. Исаева. — Астрахань: изд-во астраханского пед. ин-та, 1995. — 647 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Кісліцына, Г. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы / Г. Кісліцына. — Мінск: Логвінаў, 2006. — 210 с.
6. Современная русская литература: Хрестоматия для средней и высшей школы /сост.: В.Н. Гвоздей, М.Ю. Звягина, Г.Г. Исаев [и др.]; вступ. ст. Г.Г. Исаева. — Астрахань: изд-во астраханского пед. ин-та, 1995. — 647 с.
7. Тазік беларускі: зборнік вершаў. — Мінск: Бервіта, 1998. — 93 с.
8. Эпштэйн, М. Искусство авангардизма и религиозное сознание / М. Эпштейн // Новый мир. — 1989. — № 12. — С. 222—235.

Гоўзіч Ірына Мікалаеўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ